Новы час

30.03.2018

# Чаму Біблія Скарыны — гэта паспяховы стартап 16 стагоддзя




Стартапы існавалі заўсёды. Нават у 16 стагоддзі. Не верыце? Але 500 гадоў таму кнігадрук быў неверагодна прарыўной тэхналогіяй, параўнальнай з цяперашнім блакчэйнам.
Сёння пра Скарыну ведаюць усе. Увесь час мы кажам пра яго як пра першапачынальніка. Але чаму? Хіба ён першым выдаў кнігу? Дык жа не! Пачаў славянскае кнігадрукаванне? Таксама не ён! Апублікаваў першую кнігу кірылічным шрыфтам? Не! Першым выдаў Біблію? Першым пераклаў Біблію на нацыянальную мову? Напісаў першы літаратурны твор? Заснаваў кнігадрукаванне на тэрыторыі сучаснай Беларусі? Стаў першым навукоўцам ці першым беларускім доктарам? Не! Не! Не!
Дык у чым жа першынство Францыска Скарыны? За што мы яго любім і шануем? Чаму ім ганарымся, ставім яму помнікі, прысвячаем вершы?

Менавіта пра гэта пойдзе гаворка на лекцыі Алеся Сушы. **4 красавіка ў прасторы Imaguru у межах праект "БелЛіт: Мабільны гід" скарыназнаўца Алесь Суша**

**выступіць з лекцыяй “Чаму Біблія Скарыны — гэта паспяховы стартап 16 стагоддзя”. Пачатак у 19 гадзін.**

Ініцыятар імпрэзы — адукацыйны праект “БелЛіт: мабільны гід” ад МТС. Гэта серыя лекцый, прысвечаных беларускай літаратуры, дзе узгадаць альбо адкрыць для сябе знакавыя беларускія творы зможа любы жадаючы. Гідамі па беларускай літаратуры для слухачоў стануць пісьменнікі, выкладчыкі і медыйныя персоны. Кожны слухач лекцыі атрымае залікоўку, у якой будуць адзначацца ўсе лекцыі, якія ён наведае. Напрыканцы праекта “студэнты”, у якіх не будзе ніводнага пропуску, атрымаюць “чырвоныя” дыпломы, астатнія — граматы слухачоў.

***Алесь Суша*** *— культуролаг, кнігазаўца, даследчык і папулярызатар спадчыны Францыска Скарыны. Аўтар каля 450 публікацый, у тым ліку 7 манаграфій. Алесь Суша з'яўляецца адным з асноўных ініцыятараў шырокага святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, актывізацыі даследавання і папулярызацыі спадчыны Францыска Скарыны.*

Паводле прэс-рэлізу